NEWSLETTER BELARUS Live www.Belarus-Live.eu 06.02.2009 — 12.02.2009

Беларусь у агляднай будучыні ня ставіць задачу ўступіць у ЭЗ

Міністэрства інфармацыі ня будзе рэгістраваць інтэрнэт-рэсурсы як СМІ

У войску высьветлілася, што Хведарук непрыдатны да вайсковай службы

Сідорскі запатрабаваў паскорыць працэс прыватызацыі

Жанна Літвіна: «Застаюцца нявырашанымі ключавыя пытаньні, зьвязаныя зь дзейнасьцю журналістаў»

Год культуры Расеі ў Беларусі пачнецца 15 красавіка ў тэатры опэры і балету


photo.bymedia.net

6 лютага ў Менску прайшло першае паседжаньне Грамадзка-кансультатыўнай рады пры Адміністрацыі прэзыдэнта. Яго правёў кіраўнік Адміністрацыі Ўладзімер Макей. Са слоў высокага чыноўніка, улада зацікаўленая выслухоўваць розныя, нават палярныя меркаваньні па актуальных пытаньнях.

У раду разам з прадстаўнікамі ўладнага боку ўлучаныя незалежныя экспэрты, грамадзкія дзеячы, у тым ліку блізкія да апазыцыі.

У першым паседжаньні ўдзельнічалі, у прыватнасьці, эканаміст Леанід Заіка, ганаровы старшыня Беларускага зьвязу прадпрымальнікаў Аляксандар Патупа, былы кіраўнік Нацыянальнага банку, ганаровы старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Станіслаў Багданкевіч, кіраўнік Таварыства беларускай мовы Алег Трусаў, старшыня Беларускага Хельсынскага камітэту Алег Гулак, лідэр Беларускага кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў Аляксандар Ярашук, палітоляг і мэдыйны экспэрт Пётра Марцаў.

Кіраўніцтва Аб'яднаных дэмакратычных сілаў (АДС) пакуль што не прыйшло да адзінай думкі датычна новай структуры. Калі прадстаўнікі Партыі БНФ, напрыклад, прынцыпова супраць такой супрацы з уладамі, бо лічаць гэта гульнёй па правілах рэжыму, то старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька пакуль што не выключае, што Грамадзка-кансультатыўная рада можа стаць пляцоўкай для прасоўваньня ідэяў АДС.

10 лютага, наведваючы горад Ліду, Аляксандар Лукашэнка даволі грэбліва выказаўся пра ўдзел апазыцыі ў радзе. Ён заявіў, што на першым

паседжаньні ад яе прадстаўнікоў не прагучала нічога новага. Таксама Лукашэнка папярэдзіў, што не дазволіць апазыцыянэрам у радзе «лямантаваць ды прасоўваць брудныя ідэі».

На думку палітоляга Аляксандра Класкоўскага, «з самага пачатку было зразумела, што гэта квазіструктура, бо рада ня мае ніякіх рэальных паўнамоцтваў. А словы прэзыдэнта — сыгнал «вэртыкалі». Лукашэнка памятае досьвед гарбачоўскай перабудовы, калі зьбянтэжанасьць сярод чынавенства таксама спрыяла таму, што «працэс пайшоў» далей, чым думалі ініцыятары перабудовы. І зараз ён папярэджвае чыноўнікаў, што нічога не мяняецца, што для Эўропы нейкі дэкор робіцца, але ніякай рэальнай палітычнай альтэрнатывы такім чынам не ствараецца».

Аднак і падобныя дэкаратыўныя высілкі Менску знаходзяць ў Эўропе цёплы водгук. Стала вядома, што ў сакавіку зь візытам у Беларусі маецца быць эўракамісарка Бэніта Фэрэра-Вальднэр. А беларускі міністар замежных справаў Сяргей Мартынаў 10—12 лютага наведаў Бэрлін.

11 лютага ён правёў перамовы зь віцэ-канцлерам, міністрам замежных справаў Нямеччыны Франкам-Вальтэрам Штайнмаерам. Гэта першы двухбаковы кантакт такога ўзроўню за апошнія 14 гадоў.

Тэмай візыту сталі пытаньні разьвіцьця як двухбаковых дачыненьняў, так і стасункаў паміж Беларусьсю ды ЭЗ. Штайнмаер падкрэсьліў, што «правядзеньне далейшых дэмакратычных рэформаў застаецца перадумовай для новага пачатку ў стасунках паміж Беларусьсю і Эўрапейскім Зьвязам і для поўнага скасаваньня санкцыяў».

Між тым частка беларускай апазыцыі лічыць, што дыялёг з рэжымам, які доўжыць рэпрэсіі, ёсьць амаральным. Так, былыя палітзьняволеныя Аляксандар Казулін, Андрэй Кім і Сяргей Парсюкевіч 10 лютага распаўсюдзілі заяву ў зьвязку з затрыманьнем 8 лютага байцамі спэцаддзелу МУС «Алмаз» ваўкавыскіх прадпрымальнікаў Мікалая Аўтуховіча, Юрыя Лявонава (таксама былых палітвязьняў) і Ўладзімера Асіпенкі.

Аўтары заявы выказваюць засьцярогу, што ўлада вырашыла ўскласьці на апазыцыю адказнасьць за леташні выбух з мноствам пацярпелых у Менску. «Гэты арышт — плявок у твар афіцыйнай Эўропе і добрая дэманстрацыя гэтак званай «лібэралізацыі», — адзначаецца ў заяве. Былыя палітвязьні зьвяртаюць увагу і на тое, што пад крымінальным перасьледам па-ранейшаму знаходзяцца 14 маладых людзей, якія ўдзельнічалі ў пратэстах прадпрымальнікаў мінулай зімой, а былыя палітвязьні дагэтуль абмежаваныя ў грамадзянскіх правах.

Са свайго боку, Беларуская асацыяцыя журналістаў зьвяртае ўвагу на шэраг жорсткіх, не адпаведных міжнародным нормам артыкулаў новага Закону аб СМІ, што пачаў дзейнічаць з 8 лютага. Хаця ўлады вярнулі нядаўна ў распаўсюд два апальныя выданьні, а таксама паабяцалі абысьціся без рэгістрацыі інтэрнэт-мэдыяў, шэраг газэтаў застаецца па-за падпіскай і сыстэмай «Саюздруку» (продажу ўраздроб). Таксама назіраецца эканамічная дыскрымінацыя недзяржаўнай прэсы, абцяжараны доступ да інфармацыі.

Незалежныя экспэрты зазначаюць: калі ў эканоміцы пад уплывам крызысу пэўныя зрухі ў бок лібэралізацыі пачаліся, то палітычную і мэдыйную сфэру рэжым трымае ў абцугах вельмі моцна.

Што ж да эканомікі, то вынікі студзеня ня надта суцяшальныя. Інфляцыя сталася найбольшай за апошнія шэсьць гадоў — 4,1%. І хаця Лукашэнка 10 лютага ў Лідзе паабяцаў, што новага абвалу рубля ня будзе, насельніцтва засьцерагаецца яшчэ адной рэзкай дэвальвацыі (паўзучая і так адбываецца) ды скупляе даляры. Золатавалютныя рэзэрвы краіны, паводле інфармацыі Нацбанку, зьменшыліся да 2,9 млрд. даляраў.

Адной з крыніцаў даходаў для казны можа стаць прыватызацыя, ад якой раней улады адмаўляліся. Прэм'ер-міністар Сяргей Сідорскі 10 лютага на паседжаньні прэзыдыюму ўраду запатрабаваў



photo.bymedia.net

сыстэмнай працы па акцыянаваньні дзяржаўных прадпрыемстваў і продажы акцыяў, што знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасьці.

Але незалежныя экспэрты лічаць, што з прыватызацыяй улада запазьнілася: актывы варта было прадаваць да крызысу, на піку кошту. Звыш таго, нават ва ўрадзе прызнаюць, што закон аб прыватызацыі анахранічны.

ПАЛІТЫКА

## Беларусь у агляднай будучыні ня ставіць задачу ўступіць у ЭЗ

***Беларусь у агляднай будучыні ня ставіць задачу ўвайсьці ў Эўразьвяз. Пра гэта заявіў міністар замежных справаў Беларусі Сяргей Мартынаў.***


photo.bymedia.net

Чыноўнік падкрэсьліў, што Беларусь на нядаўняй сустрэчы з «тройкай» ЭЗ пацьвердзіла пазытыўнае стаўленьне да ідэі Ўсходняга партнэрства і бачыць у ёй канструктыўнае ядро. Але ўсе кампанэнты шматбаковага ўзаемадзеяньня ўсяго нашага рэгіёну павінны ажыцьцяўляцца на раўнапраўнай аснове.

Паводле ягоных словаў, у цяперашні час ідзе паралельны працэс дапрацоўкі асноўнага дакумэнту самога Ўсходняга партнэрства. На гэтай стадыі будучыя патэнцыйныя ўдзельнікі партнэрства ўжо прыцягваюцца ў дапрацоўку дакумэнту. Разам з тым самі дзяржавы рэгіёну пачынаюць прадумваць, якія праекты і тэмы могуць стаць зьместам партнэрства, бо само яно – гэта толькі абалонка.

*БелТА*

АФІЦЫЙНА

## Міністэрства інфармацыі ня будзе рэгістраваць інтэрнэт-рэсурсы як СМІ

***Міністэрства інфармацыі Беларусі ня мае намеру рэгістраваць інтэрнэт-рэсурсы ў якасьці сродкаў масавай інфармацыі. Пра гэта 6 лютага заявіла намесьнік міністра Лілія Ананіч.***


photo.bymedia.net

Паводле ейных словаў, палажэньня пра такую рэгістрацыю няма ў заканадаўстве, як і панятку пра інтэрнэт-рэсурсы. Закон аб друку, які набывае моц 8 лютага, не рэгулюе парадак рэгістрацыі і радак рэгістрацыі і распаўсюджваньня такіх сродкаў масавай інфармацыі.

На суб’ектыўную думку намесьніцы міністра, інтэрнэт-СМІ ў Беларусі ўжо ёсьць, але, як яна заявіла, пакуль няма ніякіх заканадаўчых актаў, датычных іх дзейнасьці.

*БелаПАН*

АПАЗЫЦЫЯ

## У войску высьветлілася, што Хведарук непрыдатны да вайсковай службы

***Гвалтоўна прызванаму ў войска моладзеваму актывісту павінны зрабіць апэрацыю на венах. Пра гэта паведамляе «Хартыя’97».***


photo.bymedia.net

У канцы студзеня Зьмітра Хведарука затрымалі і адвезьлі ў ваенкамат, нягледзячы на тое што ён вучыцца ў багаслоўскім каледжы і мае права на адтэрміноўку ад войска. Праз тры дні пасьля прыняцьця прысягі ў вайсковай часткі, 10 лютага Зьміцер Хведарук быў шпіталізаваны. Мэдыкі паведамілі апазыцыянэру, што ў яго

варыкознае пашырэньне венаў, таму, магчыма, Хведаруку будуць рабіць апэрацыю.

Адзначым, што варыкознае пашырэньне венаў зьяўляецца хваробай, зь якой забаронена служыць у войску.

ЭКАНОМІКА

## Сідорскі запатрабаваў паскорыць працэс прыватызацыі

***Прэм'ер-міністар Сяргей Сідорскі запатрабаваў паскорыць працэсы прыватызацыі і акцыянаваньня прадпрыемстваў і арганізацый Беларусі.***

Пра гэта ён заявіў на пасяджэньні Прэзыдыюму Савету міністраў. Кіраўнік ураду запатрабаваў таксама ўвесьці сыстэмную арганізацыйную працу з акцыямі ААТ.


photo.bymedia.net

Ён таксама мяркуе, што Дзяржкаммаёмасьць павінна прапаноўваць прадпрыемствам патэнцыйных інвэстараў, у тым ліку і беларускіх. Неабходна арганізаваць дакладную сыстэму перадачы прадпрыемстваў, правядзеньня конкурсаў, выхаду на замежных інвэстараў, паведамляе БелТА.

ГРАМАДЗТВА

## Жанна Літвіна: «Застаюцца нявырашанымі ключавыя пытаньні, зьвязаныя зь дзейнасьцю журналістаў»

***«Мы лічым, што закон «Аб СМІ», які ўступіў у сілу з 8 лютага, абмяжоўвае свабоду сродкаў масавай інфармацыі яшчэ больш у параўнаньні з тым заканадаўствам, якое дзейнічала да сёньняшняга дня», – заявіў намесьнік старшыні БАЖ Андрэй Бастунец на прэс-канфэрэнцыі 9 лютага.***


photo.bymedia.net

Юрыст пералічыў палажэньні закону, якія найбольш непакояць адмыслоўцаў БАЖ. Напрыклад, цяпер падставай для закрыцьця СМІ могуць стаць два папярэджаньні па любым артыкуле закону, у той час як раней - толькі па артыкуле 5). Паводле новага закону, рэдакцыя нясе адказнасьць нават за тыя матэрыялы, якія яна перадрукавала зь іншага СМІ (раней такая адказнасьць здымалася), паведамляе прэс-служба ГА «БАЖ».

«Зараз адбываюцца вельмі цікавыя і знакавыя падзеі, – зазначыла на прэс-канфэрэнцыі старшыня ГА «БАЖ» Жанна Літвіна. – Вяртаньне ў сыстэмы распаўсюду «Нашай Нівы» і «Народнай волі»; правядзеньне круглых сталоў з удзелам усіх зацікаўленых бакоў (на тэмы Інтэрнет і заканадаўства аб СМІ); прыпыненьне распрацоўкі праекту пастановы аб рэгуляваньні інтэрнэт-рэсурсаў; увядзеньне заяўнага прынцыпу перарэгістрацыі СМІ – усё гэта можна разглядаць як дэманстрацыю руху насустрач выкананьню рэкамэндацыяў Эўразьвязу і зьмяненьню палітыкі татальнага кантролю над інфармацыйнай прасторай».


photo.bymedia.net

«Тым ня менш, застаюцца нявырашанымі ключавыя пытаньні, зьвязаныя з дзейнасьцю журналістаў у Беларусі», – лічыць Жанна Літвіна. «Паранейшаму існуе манаполія выканаўчай улады на друкаваныя і электронныя СМІ, на сыстэмы распаўсюду і друку, улада дагэтуль успрымае СМІ як частку кіруючага мэханізму, якая мусіць выконваць прапагандысцкую функцыю», – канстатавала старшыня БАЖ.

КУЛЬТУРА

# Год культуры Расеі ў Беларусі пачнецца 15 красавіка ў тэатры опэры і балету

***Год культуры Расеі ў Беларусі адкрыецца на сцэне абноўленага тэатру опэры і балету 15 красавіка. Пра гэта паведаміў першы намесьнік міністра культуры Беларусі Ўладзімер Рылатка.***

Танцоўшчыкам Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатру належыць ацаніць галоўную сцэну Беларусі пасьля рэканструкцыі. «Іспытам» стане «Лебядзінае возера» Пятра Чайкоўскага.

На працягу году будуць адбывацца выступы, канцэрты расейскіх артыстаў, але самымі значнымі стануць Дзень Расеі і Дзень Масквы на міжнародным фэсьце мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» ў ліпені.

У лістападзе беларусаў чакае яшчэ адна сустрэча зь вялікім мастацтвам: заплянаваны прыезд аднаго з найлепшых аркестраў сучаснасьці – Дзяржаўнага сымфанічнага аркестру пад кіраўніцтвам Уладзімера Федасеева. Вялікі канцэрт калектыву паставіць фінальную кропку ў праграме Году культуры Расеі ў Беларусі, перадаўшы эстафэту беларускаму боку. У 2010 годзе беларуская хваля пракоціцца па Расеі: тамака адбудзецца Год культуры Беларусі.

*БелТА*

CENTRUM STOSUNKÓW MIĘDZYNARODOWYCH
CENTER FOR INTERNATIONAL RELATIONS

БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ

EUROPEAN RADIO FOR BELARUS

польская дапамога

There are various sites devoted to events in Belarus, which are, however, little known in Western Europe, and among people dealing with politics towards Belarus who do not understand the Russian or Belarusian languages.

The site belarus-live fills this gap. The site allows to order weekly reception of news in English, Polish, Belarusian, Russian.